**Рэзюмэ**

**Чарняўская Ірына Сяргееўна**

Работа 57 с., 4 раздзела, 1 табліца, 78 крыніц

МІЖТЭКСТАВАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ, ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНАСЦЬ, ПАЭТЫКА, ЛІРЫКА, ЦЫТАТА, АЛЮЗІЯ, РЭМІНІСЦЭНЦЫЯ, ПЛАГІЯТ, ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ

**Аб'ект** даследавання – лірычныя творы Людмілы Рублеўскай і Леаніда Дранько-Майсюка. У якасці канцэптуальнага кантэксту выкарыстаны творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Дубоўкі, І. Мележа, А. Макаёнка, М. Стральцова, В. Лысагорскага, А. Блока, З. Гіпіус, С. Ясеніна, М. Булгакава, П. Верлена, С. Малармэ, Г. Апалінэра, А. Рэмбо, А. Камю, Э. Спенсера, Дж. Кітса і інш.

**Мэта** работы – устанавіць асаблівасці праяўлення міжтэкставага ўзаемадзеяння ў вершах Людмілы Рублеўскай і Леаніда Дранько-Майсюка.

**Метадалагічнай базаю** навуковай работы сталі напрацоўкі замежных і айчынных тэарэтыкаў літаратуры, літаратуразнаўцаў і крытыкаў (М. Бахціна, Р. Барта, Ю. Лотмана, Е. Лявонавай, Л. Корань, Г. Кісліцынай і інш.), даследаванні ў галіне лінгвапаэтыкі, прысвечаныя вывучэнню канцэпцыі інтэртэкстуальнасці.

**Вынікі даследавання.** У працы прасочана эвалюцыя поглядаў на інтэртэкстуальнасць як адметную асаблівасць сучаснай літаратуры і іншых відаў мастацтва. Паказана спецыфіка праяўлення міжтэкставага ўзаемадзеяння ў паэзіі Л. Рублеўскай і Л. Дранько-Майсюка. Прааналізаваны спосабы ўвядзення "чужога слова" ў аўтарскі твор, абгрунтавана думка пра мастацкую мэтазгоднасць ужывання ў паэзіі названых аўтараў інтэртэкстуальных элементаў.

Матэрыялы даследавання маюць тэарэтычную і практычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры далейшым навуковым асэнсаванні праблемы інтэртэкстуальнасці ў цэлым і выяўленні яе ў творчасці канкрэтнага аўтара ў прыватнасці, у выкладанні гісторыі сусветнай і беларускай літаратуры, пры падрыхтоўцы семінараў і спецкурсаў, стварэнні падручнікаў, метадычных дапаможнікаў і вучэбных праграм, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтамі-філолагамі.

Палажэнні і вывады даследавання пра актуалізацыю інтэртэкстуальных элементаў у розных сферах сучаснай культуры (жывапіс, тэатр, кінематограф, журналістыка, рэклама і інш.) могуць уяўляць інтарэс для адпаведных спецыялістаў.